*Аляксандр Сурба*

# АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ДВУХГУКАВОЙ ДУДЫ

Беларуская двухгукавая дуда дайшла да нашага часу толькі ў выглядзе этнагарафічных фіксацый і некалькіх малюнкаў. І гэта нягледзячы на тое, што яшчэ ў XIX ст. яна заставалася самым распаўсюджаным тыпам дуд ў Віцебскай губерніі. Сёняшнія працэсы па аднаўленню аднагукавой дуды дэманструюць цікавасць беларускіх выканаўцаў і майстроў да вяртання астатніх тыпаў дуд на Беларусь. Аднак працэсы асэнсавання і вяртання беларускіх дуд розных тыпаў носяць неадназначны характар. Найбольшая ўвага сёння надаецца аднагукавым дудам і дудам-мацянкам. Двухгуковыя дуды яшчэ чакаюць вывучэння і вяртання. Наша даследаванне грунтуецца на аб’ектыўных фактах аб двухгуковых дудах, ўласным досведзе аўтара ў майстраванні дуд і прапануе некаторыя варыянты рэканструкцыі.

М. Нікіфароўскі адзначае [1, с. 7], што знешні выгляд двухгукавой дуды звычайна просты і аднаабразны ва ўсіх выпадках. Дадзеная заўвага датычылася да рэгіёну Віцебскай губерніі. Мех дуды, паводле М.Нікіфароўскага робіцца з барсука, цялёнка альбо казлёнка. Часцей за ўсё корпус дуды шыты з суцэльнага кавалку скуры. Скура павінна была быць мяккай, не прапускаць паветра, а дзеля гэтага прапітваецца жырам ці чыстым дзёгцям. У верхнюю частку меха, бліжэй да шыйкі, ўстаўляецца драўляная трубаска «соска», прыкладна 4 вяршкі (178 мм) ў даўжыню. Дзеля таго, каб паветра пасля надзмування невыходзіла вонкі, з ніжняга тарцу «соскі» мантуецца «залог», альбо клапан. Аднак некаторыя соскі немаюць названнага залогу, а спыненне адваротнага току паветра суправаджаецца «заломам» і адваротам «соскі» у бок. У бліжэйшую шыйку меху ўстаўляецца перабор, каля 8 вяршкоў (356 мм), з 6 клапанымі адтулінамі спераду і адной адтулінай ссаду. У верхні тарэц перабору ўстаўлены пішчык з пяра. Вынуты перабор, па сцвярджэнню М.Нікіфароўскага, з’яўляецца «жалейкай» і можа заіграць адну актаву дыятанічных гукаў. Па адзін і другі бок ад перабору ў мех мантуюцца 2 гукі. Па знешняму выгляду яны нагадваюць даследчыку курыцельныя трубкі. Даўжыню гукі маюць неаднолькавую: адзін карацей другога на адну чвэрць. Такая даўжыня гукаў пры ўмове ўстаноўкі ў іх тарцы аднолькавых пішчыкаў, пры гарнні павінны даваць інтэрвал у кварту (3/4), а калі «падцягнуць» пішчык то квінту [1, с.8]. Цікавыя апісанні і ўражанні М.Нікіфароўскага наконт вырабу дуды, а таксама сталярных інструментаў і матэрыялаў. Скура, сала, дзёгаць, гусінае, некалькі драўляных чурак, нож, шыла, тоўсты дрот, альбо бураўчык ці свярдзёлак служаць для вырабу звычайнай дуды. Аднак такую дуду можа зрабіць не абы які «прастак», а толькі «знаток дударскай справы», які валодае «музычным вухам». Даследчык прыводзіць некалькі стадыяў вырабу дуды: зрэзаць малады пабег кляновага дрэва на соску і перабор (у маладзік, замест іншай лунный чвэрці); пажадана выкарыстаць адзіны кавалак дрэва, лепш нават з аднаго пня; пяро для пішчыка трэба карыстаць «ранянае» замест з «убойнай» птушкі. Таксама немалаважна «едынацтва» пры вырабе дударом інструмента. «Гукі-самародкі», так называе М.Нікіфароўскі гукі, якія выстраганы разам з ражкамі-раструбамі з аднаго кавалку дрэва, трэба пільна шукаюцца па лесе ў адпаведнасці з формай ізноў жа маладзіком. Пры майстраванні і настроўцы дадзенага гука, неабходна свідраваць, альбо пражыгаць канал дротам, затым сфарміраваць варонку (падабенства ражка-раструба), устанавіць пішчык і перамяшчаць яго ўздоўж канала для настройкі. Настройка можа быць таксама праз укарачэнне агульнай даўжыні гука, а таксама праз павялічэнне «варонкі» ражка-раструба [1,с.9].



**Малюнак 1 – Р.Жукоўскі «Беларускае вяселле» (фрагмент)**



**Малюнак 2 – Рэканструкцыя дуды паводле малюнка Р.Жукоўскага «Беларускае вяселле»**

Такім чынам, двухгуковая дуда, апісаная і зафіксаваная М.Нікіфароўскім выступае як адзін з самастоўных тыпаў дуд Віцебскай губерніі. Трэба адзначыць, што тэхналогія вырабу і канструкцыя такой дуды яскрава паказвае прымітыўнасць і архаічнасць мясцовай традыцыі. Гукі маюць суцэльную форму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(немаюць «слайду» дзеля падстройкі). Выкарыстанне ранянага пяра, клёну на «маладзік».а таксама скура ахвярнай забітай жывёлы відаць звязана з абрадам ахвярапрынашэння з дахрысціянскіх часоў. Кансерватызм у вырабе сведчыць пра досыць распрацаваную сістэму поглядаў дудара, таму магчыма тэхналогія так
і засталася на прымітыўным, альбо традыцыйным ўзроўні. Нажаль, М. Нікіфароўскі нічога не паведамляе пра дэкор дадзенага тыпу дуд. Прычынамі таму былі, відаць, альбо адсутнасць дэкору ўвогуле, альбо наяўнасць яго не наўсіх дудах. Відавочна, што ў межах жорсткай традыцыі вырабу дуды павінны былі быць хацяб элементы дэкору. Адсутнасць такіх важных акалічнсцей з’яўляецца сур’ёзнай стратай для працэсу сучаснай рэканструкцыі.

Іканаграфічныя сведчанні існавання дуды дадзенага тыпу досыць скудныя. Нам удалося выявіць толькі некалькі ілюстрацый гэтага інструменту. Відаць двухгукавая дуда была вядома беларускаму мастаку Р.Жукоўскаму. Вядомы яго 3 малюнкі з інструментамі такога кшталту. На першым малюнку Р.Жукоўскага «Беларускае вяселле» [2, с.356] (мал.1) бачна на левай частцы сілуэт дудара з дудой.

Зм.Сасноўскі [2, с.355] адзначае, што на дадзенай дудзе жалейка (перабор) мае накладную рагаўню (маецца на ўвазе састаўную), бурдоны цэльныя (г.зн.гукі), зробленыя з адных самародных кавалкаў дрэва. Аўтар слушна мяркуе, што гэтыя гукі-самародкі зроблены шляхам выбірання і прапальвання, альбо разразання ўздоўж і далейшай ўнутраняй апрацоўкай. Наша меркаванне на гэты конт амаль супадае з поглядам Зм. Сасноўскага, але адзначым таксама наяўнасць на малюнку, не вельмі якасна бачнага, сілуэту берасцяной сцяжкі, якая выкарыстоўвалася пры аналагічным вырабе сурмаў. Улічваючы гэты факт, мы рэканструявалі выгляд дзвухгуковай дуды (мал.2) паводле малюнку «Беларускае вяселле», з некалькімі акалічнасцямі: паводле М.Нікіфароўскага на дудах дадзенага тыпу мех быў шыты, адзін гук даўжэйшы за другі на 1/4 (на малюнку гукі маюць аднолькавую даўжыню), а таксама месца мантажу соскі, паводле М.Нікіфароўскага, бліжэй да шыйкі перабору (на малюнку вельмі недакладна прамалявана дадзеная акалічнасць).

На другім малюнку Р.Жукоўскага, змешчанага на франтыспісе І тома зборніка «Шляхціц Завальня» (1844 г.) [3], змешчаны досыць маленькі сілуэт чорта, граючага на дудзе (мал.3).



**Малюнак 3 – Чорт з дудой. Малюнак Р.Жукоўскага (фрагмент)**



**Малюнак 4 – Р.Жукоўскі «Ля карчмы» (фрагмент)**



**Малюнак 5 – Рэканструкцыя дуды з малюнка «Ля карчмы» Р.Жукоўскага**

Малюнак не дазваляе сказаць дакладна пра асаблівасці канструкцыі гэтай дуды, але відавочна, што гэта двухгукавая дуда, вельмі падобная на апісанні М.Нікіфароўскага. На малюнку, відаць, што шех шыты, гукі прамыя, на пераборы замест рагаўня канічны раструб. На першы погляд зусім непанятна, як такая дуда зроблена, але нашчасце Р.Жукоўскі заставіў яшчэ адну ілюстрацыю двухгуковай дуды. На малюнку «Ля карчмы» [2, с.357] (мал.4) можна разглядзець дудара з дудой. Зм.Сасноўскі сцвярджае, што гукі зроблены з цэльных кавалкаў дрэва шляхам прадольнага распілу і далейшага сцягвання драўлянымі ці жалезнымі абручамі.

На наш погляд два апошнія малюнкі дэмаструюць трохі іншы тып двухгукавой дуды, чым у апісаннях М.Нікіфароўскага. Тут відавочна наяўнасць дзвух мадыфікацый: з раструбамі закручанымі і роўнымі канічнымі. На малюнках «Ля карчмы» і «Чорт з дудой» выразна бачна, што гукі зроблены з цэльнага кавалку дрэва, але на іх умантаваныя слаба канічныя раструбы, якія якраз і маглі быць зроблены шляхам прадольнага распілу. Для замацоўкі і цэласнасці такой канструкцыі яны насамрэч маглі сцягвацца жалезам, альбо лазой. Рэканструкцыя дадзенага тыпу дуды прапануецца мал.5.

Яшчэ адным цікавым прыкладам двухгуковай дуды падаецца на малюнку «Дудар беларускі» П. Аненскага [4, с.53] (мал.6).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Малюнак 6 – Дудар беларускі. Малюнак П.Аненскага. Ілюстрацыя да «Заходнерускіх нарысаў» П.М. Шпілеўскага. 1859 г. Прадстаўлена беларускя дуда двухгуковага тыпу**



**Малюнак 7 – Рэканструкцыя дуды з малюнка П.Аненскага**

Гэтая дуда, з'яўляецца бадай самай архаічнай з разглядаемага шэрагу двухгуковых беларускіх дуд. Сапраўды М.Нікіфароўскі апісвае дуды пераважна з Віцебскай губерніі, г.зн. Поўначы Беларусі. Малюнкі Р.Жукоўскага амаль адпавядаюць апісанням М. Нікіфароўскага. А воль малюнак П.Анненскага хутчэй за ўсё ілюструе Паўднёвы тып (Палессе) двухгукавой дуды. На малюнку відаць досыць вялікі мех, зняты панчохай. Зм. Сасноўскі піша [2,с.358], што абодва гукі ўстаўлены ў «ножкі меху», але тут не зусім так. Перабор умантаваны ў адну з «ножак», маленькі гук таксама ўмантаваны ў «ножку», а вось вялікі гук ўстаўлены ў «шыйку» меху. Гукі маюць форму слаба-канічну форму, а вось перабор не мае аніякага раструба ўвогуле. На дадзеным малюнку не бачна перахаднікоў-стокаў, што падцвярджае нашу думку аб глыбокай архаічнасці такой канструкцыі. Таксама адсутнічае і соска. Магчыма дудар пры надзмуванні меху трымаў соску зубамі, а пасля таго ён мог заламываць яе пад мышку, каб паветра не выходзіла і спяваць. Калі паветра скончвалася, цыкл паўтараўся зноў. Наша рэканструкцыя выгляду такога тыпу дуды прыведзена на мал.7.

Такім чынам мы разгледзілі адзін з тыпаў беларукіх дуд — двухгуковую дуду. Нажаль звестак на гэту тэму засталося не так шмат, але яны дазваляюць правесці пэўную рэканструкцыю дадзенага інструмента. Мы выявілі вельмі важную акалічнасць: пры перамяшчэнні з Поўдзеня на Поўнач змяняецца форма меху двухгукавой дуды, а таксама форма раструбаў гукаў) яна становіцца больш закручаная, альбо выгнутая). З пункту гледжання тэхналогіі вырабу, дуда з Палесся, намаляваная П.Аненскім, з'яўляецца больш прымітыўнай і простай чым Паўночныя дуды Р.Жукоўскага, што з'яўляецца падцверджданнем больш архаічнай і кансерватыўнай традыцыі Поўдня ў адносінах да Поўначы. Важным нераскрытым пытаннем застаецца дэкор беларускіх двухгукавых дуд. Ані М.Нікіфароўскі, ні Р.Жукоўскі ні П.Анненскі не падаюць ніякіх звестак пра дэкор двухгукавых дуд. І хаця на сёняшні дзень намі не выяўлена больш звестак пра двухгукавы тып дуд, ўсёж пытанне дэкору застаецца адкрытым, магчыма далейшая праца даследчыкаў па пошуку выяў пралье святло на гэты аспект.

**Спіс літаратуры:**


1. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Дудар и музыка / Н.Я. Никифоровский. – М. : Товарищество Скоропечати А.А. Левенсон, 1892. – 33 с.
2. Сасноўскі, Зм.А. Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Зм.А. Сасноўскі. – Мінск : Харвест, 2010. – 416 с.
3. Barszczewski, J. Szlachcic Zawalnia czyli Bialorus w fantastycznych opowiadaniach / J. Barszczewski. – Petersburg : Drukarnia Karola Kraja, 1844. – 113 s.
4. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П.М. Шпилевский. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ